праведзена, песенная традыцыя раёна мала вывучана. На працягу XX ст. толькі некаторыя даследчыкі звярталіся да вывучэння песеннай традыцыі Лідскага раёна (Р. Шырма, Т. Варфаламеева). Да апошняга часу ў фондах КТМК БДАМ таксама захоўваліся кропкавыя архіўныя фіксацыі з гэтага раёна. У 2016 годзе была здзейснена фальклорная экспедыцыя БДАМ па Лідскаму раёну. У ходзе экспедыцыі была праведзена вялікая работа па даследаванні раёна, тэрыторыя якога ўваходзіць у гісторыка-этнаграфічны рэгіён Панямонне. Рэпрэзентуя асноўнае кола каляндарных абрадаў Лідчыны, мы адзначаем, што яно складалася з галоўных абрадаў, якімі з'яўляюцца Каляды, Валачобны/Вялікдзень і Жніво. Па матэрыялах запісанага адзначым, што ў нашыя часы амаль усе абрады эвалюцыяніравалі, аднак некаторыя ўзоры ўсё ж захоўваюць архаічныя асаблівасці выканання. Асноўная частка зафіксаваных песень – вялікі пласт лірычных песень – адносіцца да больш позняга перыяду: пасля XV–XVII стагоддзяў. Нягледзячы на тое, што прыкладаў менавіта каляндарна-песеннай культуры на Лідчыне было запісана не шмат, усё роўна вылучаюцца іх некаторыя стылёвыя асаблівасці, характэрныя для дадзенага раёна.

Зімні перыяд на Лідчыне ярка прадстаўлены калядным абрадам. Цікава, што на Лідчыне моладзь хуліганіла на каляды. Аснову вясенняга перыяду складаюць валачобныя абрадавыя дзействы. Мы атрымалі шмат паведамленняў пра тое, як здзейсніваўся абыход валачобнікаў, зафіксавалі некаторыя валачобныя песні. Характэрным для дадзенага рэгіёна з'яўляецца захаванне некаторых дахрысціянскіх, язычніцкіх назваў. Так, хрысціянская Троіца ў Лідскім раёне захавала сваю архаічную язычніцкую назву «Сёмуха». Аснову летне-асенняга календара складае абрад жніва. Ён праходзіць у тры этапа і з'яўляецца кульмінацыяй каляндарна-земляробчай дзейнасці. Трэба адзначыць суіснаванне на тэрыторыі Лідчыны двух хрысціянскіх канфесій (каталіцызм і праваслаўе), якое з'яўляецца характэрнай асаблівасцю рэгіёна, што знайшло адлюстраванне нават у павелічэнні тэрмінаў святаў.

Фальклорная экспедыцыя БДАМ 2016 стала толькі пачаткам даследавання Лідскага раёна, таму што шмат вёсак яшчэ не давялося наведаць. Нажаль, многія жыхары не памятаюць ранейшых песень, кажуць, што калі б мы прыехалі раней, то яны бы больш нам заспявалі і расказалі. Але нават тое, што яны яшчэ могуць нам паведаміць, з'яўляецца вельмі важным матэрыялам для знаёмства з календарна-абрадавай песеннай творчасцю Лідскага раёна. Дзякуючы фальклорнай экспедыцыі 2016 года на сенняшні дзень мы маем вялікі пласт менавіта песеннай традыцыі Лідчыны.

©БДУ

## РЭСПУБЛІКА БЕЛАРУСЬ І ПРАБЛЕМА ЎРЭГУЛЯВАННЯ ЎКРАІНСКАГА КРЫЗІСУ Ў 2013–2015 гг.

**Г. Я. САЛАЎЁЎ**

**НАВУКОВЫ КІРАЎНІК – У. Е. СНАПКОЎСКІ, ДОКТАР ГІСТАРЫЧНЫХ НАВУК, ПРАФЕСАР**

Артыкул распавядае пра афіцыйную пазіцыю Беларусі адносна ўкраінскіх падзей 2013–2015 гг., аналізуючы заявы, выступленні, інтэрв'ю Прэзідэнта, МЗС Беларусі, меркаванне навуковай супольнасці. Мэта работы – аналіз пазіцыі і ролі Мінска да Еўрамайдану, крымскіх падзей, канфлікту на паўднёвым усходзе ад саміту Усходняга партнёрства ў лістападзе 2013 г. да сустрэчы ў нармандскім фармаце ў Мінску ў лютым 2015.

Ключавыя словы: украінскі крызіс, крымскі рэферэндум, Мінскі працэс, Украіна.

Пасля непадпісання В. Януковічам Пагаднення ад асацыяцыі з ЕС і выбару на карысць інтэграцыі ў постсавецкія структуры, у Кіеве 28 лістапада 2013 г. успыхнулі акцыі пратэсту, якія ва ўкраінскай і заходняй гістарыяграфіі атрымалі назву рэвалюцыі годнасці або Еўрамайдану. Яны прывялі да ўхілення В. Януковіча ад выканання прэзідэнцкіх паўнамоцтваў і змены ўлады 21 лютага 2014 г. Беларусь выказалася супраць любога ўмяшальніцтва з вонку ў справы суверэннай дзяржавы і за ўрэгуляванне крызісу шляхам канструктыўнага дыялогу. А. Лукашэнка раскрытыкаваў збеглага ўкраінскага прэзідэнта, а ў МЗС Беларусі заявілі, што пачнуць будаваць адносіны з новым ўрадам Украіны па меры яго фарміравання, што адбылося 28 лютага 2014 г.

У адказ на кіеўскія падзеі, Расія санкцыянавала высадку ўзброеных кантынгентаў на крымскім паўвостраве і за пару тыдняў усталявала адміністрацыйны кантроль на ўсёй тэрыторыі Крыма. А. Лукашэнка сфармуляваў асноўныя падыходы Беларусі да ўкраінскіх падзей: важнасць захавання тэрытарыяльнай цэласнасці Украіны; анексія Крыма – небяспечны прэцыдэнт, ён дэ-факта стаў часткай Расіі, але дэ-юрэ не з'яўляецца праз адсутнасць міжнародных пагадненняў; тэрыторыя Беларусі ніколі не будзе выкарыстоўвацца для нападзення на Украіну. Пасля правядзення крымскага рэферэндума 16 сакавіка 2014 г., Беларусь заняла ўхілістую пазіцыю і выказалася, што зробіць усё магчымае, каб вярнуць адносіны Украіны і РФ да добрасуседскіх, але ў ААН галасавала супраць украінскай рэзалюцыі па тэрытарыяльнай цэласнасці, спаслаўшыся на традыцыйны супраціў любым краінавым рэзалюцыям.

Крымскія падзеі распаўсюдзілі працэс дэстабілізацыі і на паўднёва-ўсходнія раёны Украіны, дзе ўзброеныя фарміраванні захапілі адміністрацыйныя будынкі ў Данецку і Луганску, што прывяло да

здзяйснення Украінай антытэрарыстычнай аперацыі. А. Лукашэнка выказаў сваю ўпэўненасць у хуткай перамозе ўкраінскай арміі, а таксама супраць любой мадэлі федэралізацыі краіны і заявіў, што не прызнае і не падтрымае ДНР і ЛНР. Але ўжо летам 2014 г. стала зразумелым, што канфлікт зацягваўся праз магутную матэрыяльную дапамогу Расіі самаабвешчаным рэспублікам. Гэта прывяло да згоды Беларусі стаць міратворцам (да гэтага моманту яна адмаўлялася) у расійска-ўкраінскім канфлікце, што вылілася ў жнівеньскі саміт МС-Украіна-ЕС у Мінску. Саміт даў старт Мінскаму працэсу па ўрэгуляванні канфлікту і пачатак пасяджэнняў трохбаковай кантактнай групы (Украіна-РФ-АБСЕ з прадстаўнікамі ДНР і ЛНР) у Мінску. У верасні 2014 г. яны прынялі два дакументы Пратакол аб спыненні агню і Мемарандум аб выкананні палажэняў пратакола, што атрымала назву Мінск-1. У выніку чарговай эскалацыі напружанасці ў пачатку 2015 г., у Мінску 11-12 лютага сабраліся лідары нармандскай чацвёркі (ФРГ-Францыя-Украіна-РФ), якія прынялі непадпісаную Дэкларацыю трох прэзідэнтаў і канцлера ў падтрымку Комплекса мер па выкананні Мінскіх пагадненняў, што былі прыняты на паралельным пасяджэнні ТКГ. Гэтыя два дакументы ўвайшлі ў гісторыю як Мінск-2 і, хоць і не спынілі канфлікт, але значна скарацілі колькасць разбурэнняў і загінулых грамадзянскіх асобаў.

Беларусь пераканана выступала за захаванне тэрытарыяльнай цэласнасці Украіны, прызнала новую ўладу і запэўніла ў падтрымцы суверэнітэту і нейтралітэту ў канфлікце.

©БГАМ

## ОПЕРА-МИСТЕРИЯ «ТИЛЬ УЛЕНШПИГЕЛЬ» Н. КАРЕТНИКОВА: ОСОБЕННОСТИ ЖАНРА И МУЗЫКАЛЬНОЙ ДРАМАТУРГИИ

**Л. А. СЕМЁНЧИК**

**НАУЧНЫЙ РУКОВОДИТЕЛЬ – Н.Г. ГАНУЛ, КАНДИДАТ ИСКУССТВОВЕДЕНИЯ, ДОЦЕНТ**

Опера-мистерия Н. Каретникова «Тиль Уленшпигель» комплексно анализируется в аспекте жанровой специфики и особенностей музыкальной драматургии. Выявляются характерные принципы пространственно-временной организации оперного действия и музыкальной стилистики.

Ключевые слова: опера-мистерия, Николай Каретников, мистерия, Тиль Уленшпигель, мистериальное действо.

Опера-мистерия – уникальное явление в истории европейской оперной культуры от эпохи барокко до наших дней. В XX веке происходит эволюция оперного жанра, которая во многом обусловлена расширением его границ. В современной опере особое развитие получила идея, связанная с мистериальными традициями. Наиболее актуальными в аспекте оперы-мистерии выступают следующие параметры, характерные для этого жанра: включение ритуальных актов в процесс развития действия; многоярусность, и «монтажность» драматургии; наличие символов и символических персонажей; синхронность пространственно-временных процессов внутри действия, но при этом открытость времени и пространства самого представления; показ событий, ситуаций и страданий героев, вызывающих эмоционально-психологические переживания зрителей.

По своей внутренней сути опера «Тиль» ассоциируется с литургическим действом. В опере проявляется квазижитийный вариант мистериального жанра. Во многих сценах присутствует отражение ритуала. Два акта оперы-мистерии образуют картину судьбы главного героя – Тиля: пройдя первый круг испытаний, потеряв близких людей (отца и мать), соприкоснувшись с духовным миром (финал первого акта), Тиль возвращается в реальный мир, чтобы всё осознав, пройти свой путь до конца.

Музыкальный материал «Тиля» разнообразен, но при этом изнутри объединен связями, которые позволяют музыкально-символическим темам оперы взаимопроникать друг в друга, трансформироваться. В противостоянии представлены песенные и танцевальные жанры (танец – метафора открытого пространства, воплощающая идею единения, а песни – внутреннее пространство, которые помогают осветить путь Героя). Практически каждая песня имеет образно-содержательный и музыкальный (реже) прототип: второй дуэт Тиля и Ламме «Герцог Альба – смрадный пёс», хор фламандцев в сцене боя решены в жанре, именуемом песни гёзов; песни Неле уподобляются «женским песням» миннезингеров, которые опирались на древнейшие фольклорные традиции. Появляется смысловая перестановка хоровых номеров по отношению к таким же хорам в «Мистерии апостола Павла»: в «Мистерии» – это хоры первохристиан, в «Тиле» они превращены в «умерщвлённые латынью» хоры пыток. Двояко отмечен и заключительный танец главных героев, с мотивом Dies irae в партии оркестра.

Главная мистериально-сакральная идея оперы – Вера, как нравственный высший закон бытия. Надежда на Воскресение подтверждают мистериальную направленность «Тиля» и проявляются в архетипической структуре ритуального действа – от умирания к воскрешению. Каждый человек имеет свой крестный путь, каждый достоин сострадания – эта интонация главенствует в опере.